# Беларускія народныя музычныя інструменты: эвалюцыя развіцця (учора і сёння)

Беларускія народныя музычныя інструменты — артэфакты мастацкай фальклорнай творчасці. Разам з майстрамі, намаганнямі якіх інструменты нараджаюцца, музыкантамі, якія на іх іграюць, музыкай, якая ствараецца творчай фантазіяй выканаўцаў і народам, эстэтычныя патрабаванні якога заахвочваюцца, яны фарміруюць унікальны свет народна-інструментальнай культуры.

Створаныя народам, з'яўляючыся неад'емнай часткай светапогляду, звычаяў, абрадаў, свят і штодзённага побыту народа, музычныя інструменты па праве называюцца народнымі.

З дапамогай музычных інструментаў нашы продкі наладжвалі кантакт з патаемнымі сіламі навакольнай прыроды падчас абрадаў каляндарна-земляробчага і сямейна-побытавага кола, перадавалі папераджальныя сігналы, стваралі ўмовы для аднаўлення фізічных сіл і страчанай эмацыянальнай раўнавагі і інш. Без гучання народных інструментаў цяжка ўявіць жыццё беларускай вясковай абшчыны.

Сярод музычных інструментаў беларускага народа шмат «тутэйшых» — тых, што нарадзіліся на нашай зямлі. Часцей за ўсё гэта даволі простыя па канструкцыі гукавыя прылады: свісцёлкі, дудкі, жалейкі, пастуховы драўляныя трубы і некаторыя іншыя.

Інструменты, канструкцыйна больш складаныя, часцей за ўсё былі запазычаны беларусамі з іншых культур. Адкрытая еўрапейская арыентацыя беларускай культуры падчас існавання Вялікага Княства Літоўскага і змяніўшая яе накіраванасць на расійскую культуру пасля ўваходжання Беларусі ў склад Расійскай імперыі значна паўплывалі на музычны інструментарый беларусаў. У прыватнасці, у эпоху Вялікага Княства Літоўскага дзякуючы беларускім магнатам, студэнтам, якія вучыліся ў еўрапейскіх універсітэтах, вайскоўцам, а таксама іншаземным запрошаным да каралеўскага двара і вандроўным музыкантам, былі прыўнесены ў беларускую культуру ліра, дуда, скрыпка, цымбалы. У 18—19 стагоддзях з Расіі ў беларускую музычную культуру прыйшлі балалайка, гітара, гармонь.

Запазычаныя інструменты вельмі хутка прыжыліся і сталі часткай духоўнай культуры народа. Строй і гукарад тых, што падабаліся вясковым музыкантам і жыхарам па сваіх выразных якасцях, былі прыстасаваны да традыцыйнай музыкі і ў хуткім часе пачалі вырабляцца мясцовымі майстрамі. Такія інструменты ўсё часцей гучалі падчас святаў і абрадаў, актыўна ўключаліся ў абшчынны побыт і з цягам часу набывалі статус народных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Belarusian folk musical instruments: Evolution of Development (yesterday and today)

Belarusian folk musical instruments are the artifacts of artistic folklore. Together with the masters, with whose efforts the instruments are born, musicians who play on them, music, which is created by creative imagination of artists and people, whose aesthetic requirements are encouraged, they form a unique world of folk instrumental culture. Created by people and being an integral part of the world, customs, rituals, festivals and daily life, musical instruments often are rightly called folk ones.

With musical instruments, our ancestors arranged contact with hidden forces of environmental nature during ceremonies of calendar-agricultural and family-community circle, triggered alarms, created conditions for the restoration of physical strength and the lost emotional balance and so on. Without the sound of folk instruments it is difficult to imagine the life of the Belarusian village community.

Among the musical instruments of the Belarusian people there are a lot of «local» one's — born on our land. Most often it is audio devices of rather simple design: whistles, pipes, sackbuts, pastoral wooden pipes and others. Musical instruments, which are structurally more complicate, Belarusians have borrowed from other cultures. Open European orientation of the Belarusian culture during the existence of the Grand Duchy of Lithuania and Russian orientation of culture after the entry of Belarus into the Russian Empire greatly influenced the musical instruments of the Belarusians. So, during a period of the Grand Duchy of Lithuania due to the Belarusian magnates, students studying in European universities, the military men and foreigners, who were invited to the royal court and a traveling musicians, lyre, duda (back-pipes), skrypka (fiddle), tsymbaly (cymbalo) were brought into the Belarusian culture. In the 18th — 19th centuries balalaika, guitar, harmonica came into Belarusian musical culture from Russia.

Borrowed instruments very quickly settled down and become a part of the spiritual culture. Tuning systems and tone rows of those instruments which became popular among country musicians and residents, were adapted to the traditional music and soon began to be produced by native craftsmen. Such musical instruments often sounded during the holidays and rituals and were actively involved in community life and acquired a status of folk instruments.

However, the Belarusian folk instrumental culture included not only new musical instruments, but also borrowed music, musical techniques. Folk instrumental culture of Belarus was gradually expanding and enriching, filling with a variety of timbres-colours.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разам з тым у беларускую народна-інструментальную культуру ўваходзілі не толькі новыя музычныя інструменты, але і запазычаныя музыка, выканальніцкія прыёмы. Народна-інструментальная культура беларускага народа паступова пашыралася і ўзбагачалася, квітнела разнастайнымі тэмбрамі-фарбамі.

Здаўна асноўнымі формамі выканальніцкай інструментальнай традыцыі з'яўляліся сольная і ансамблевая. Сольна, ці паасобку, аматары ігралі, радавалі сябе і сваіх родных гукамі балалайкі, мандаліны, акарыны. У полі летам, а зімою ў хаце забаўляліся пастухі, іграючы на дудцы ці жалейцы. Сольнае выкананне было характэрна і для лірнікаў — вандроўных музыкантаў-старцаў. Дудары, скрыпачы, пазней і гарманісты даволі часта дэманстравалі сваё майстэрства валодання інструментам, напрыклад, падчас вяселля або вячорак.

Акрамя гэтага, амаль у кожнай вёсцы існавалі інструментальныя ансамблі прафесійных вясковых музыкантаў. Часцей за ўсё ў іх складзе былі 2—4 чалавекі, якія выконвалі заказ абшчыны і яе асобных прадстаўнікоў. Аднак часам для выканання вясковых песень і танцаў з нагоды нейкіх урачыстасцей мясцовыя магнаты запрашалі вялікія капэлы народных музыкантаў з 10—12 чалавек.

Аналіз фоназапісаў і расшыфраваных фалькларыстамі сольных і ансамблевых найгрышаў, запісаных ад народных музыкантаў, сведчыць аб іх незвычайна высокім узроўні валодання інструментам, багатай фантазіі, разнастайнасці падыходаў да творчага працэсу.

У пачатку 20 стагоддзя моладзь, натхнёная рэвалюцыйнымі ідэямі, пакідала родныя мясціны і імкнулася ў горад будаваць новае жыццё, скарыстоўваць новыя магчымасці і шляхі самавыяўлення, што спрыяла папулярызацыі беларускіх народных музычных інструментаў. Незвычайны выгляд, своеасаблівы тэмбравы каларыт, нацыянальная самабытнасць гучання гэтых інструментаў і, безумоўна, талент народных музыкантаў прыцягнулі ўвагу творчай інтэлігенцыі — мастакоў, паэтаў, артыстаў, музыкантаў. Іх намаганнямі народныя музычныя інструменты ў хуткім часе «выйшлі» на сцэну.

Відавочна, новыя акустычныя ўмовы існавання інструментаў патрабавалі правядзення работ па іх адаптацыі да іншай музыкі, іншых эстэтычных крытэрыяў, якія склаліся ў агульнаеўрапейскай сцэнічнай практыцы і якімі кіраваліся слухачы канцэртных залаў. Дзякуючы нястомнай энергіі і таленту музыканта-аматара Дзмітрыя Захара і фартэпіяннага настройшчыка Канстанціна Сушкевіча беларускія дудка, цымбалы і ліра арганічна ўпісаліся ў прынцыпова новае для іх сцэнічнае асяроддзе. Тым самым прадвызначылася адначасовае існаванне беларускіх народных музычных інструментаў у двух вымярэннях: аўтэнтычным, натуральным для іх, і ў штучным, сцэнічным.

На жаль, Першая і Другая сусветныя войны, сацыяльная і тэхнічная рэвалюцыі, імклівы наступ цывілізацыі карэнным чынам змянілі ўмовы існавання традыцыйнай беларускай культуры. Сцэна паступова стала бадай ці не адзіным арэалам выканальніцтва на народных музычных інструментах. Шмат якія з іх увогуле сышлі ў нябыт.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Since olden times the main forms of performing traditions were instrumental solo and ensemble ones. Amateurs played solo enjoying themselves and their relatives with the sounds of the balalaika, mandolin, ocarina. In the summer in the field and in winter at home shepherds took pleasure playing a dudka (pipe) or a zhaleyka. Solo was also often played by lyrists — roving musicians-elders. Dudars (bagpipers), violinists, and later accordionists often demonstrated their mastery during a wedding or evening parties.

Besides in almost every village there were instrumental ensembles of professional village musicians. Most often there were over 2—4 people, who carried out the order of the community and its individual members. Sometimes, however, to perform singing and dancing, dedicated to the native celebrations, magnates invited groups of musicians, consisting of over 10 or 12 persons. The analysis of phonograms and solo and ensemble folk tunes recorded from folk musicians and decrypted by folklorists, shows its high level of mastering the instrument, rich fantasy and a great variety of ideas about the creative process.

In the early 20th century, young people, inspired by the revolutionary ideas, left their native areas and rushed to the town to build a new life, to try out new possibilities and ways of self-expression, which contributed to the popularization of the Belarusian folk musical instruments. Unusual form, peculiar timbre colouring, the national identity of sounding of these instruments and, of course, the talent of folk musicians attracted the attention of the creative intelligentsia — artists, poets, actors, musicians. Due to their efforts folk musical instruments soon appeared on the scene.

Obviously, the new acoustic conditions of the existence of instruments required work on their adaptation to other music and other aesthetic criteria, which were in prevailing practice in the European stage and were usual for the audience of concert halls. Thanks to the tireless energy and talent of amateur musician Dzmitry Zahhar and piano tuner Constantine Sushkevich Belarusian dudka (pipe), tsymbaly and lira (lyre) organically fitted into a brand new for them stage environment. Thus simultaneous existence of the Belarusian folk musical instruments in two dimensions: an authentic, natural to them, and in the artificial, scenic was predetermined. Unfortunately, the First and Second World Wars, social and technological revolutions, the rapid advance of civilization radically changed the conditions of existence of the traditional Belarusian culture. The scene has gradually become almost the only habitat of playing national musical instruments. Many of them even went into oblivion.

But in the early 1980s, the scientific publication of national research worker of ethnic instruments I.D. Nazina dedicated to the diversity and unusual richness of national instruments, the complicate history of the origin and social functioning of musical instruments of the Belarusian village, contributed to raising the question of the uniqueness of just authentic instrumental musical culture of the Belarusian people.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Але ў пачатку 1980-х гадоў навуковае выданне айчыннага этнаінструментолага І.Д. Назінай, прысвечанае шматграннасці і незвычайнаму багаццю нацыянальнага інструментарыя, складанай гісторыі паходжання і сацыяльнага функцыянавання музычных інструментаў беларускай вёскі, спрыяла пастаноўцы пытання аб унікальнасці менавіта аўтэнтычнай інструментальнай музычнай культуры беларускага народа.

У 1990-я гады ў межах новай фальклорнай хвалі, руху за нацыянальную незалежнасць і адраджэнне Беларусі энтузіясты-прыхільнікі беларускага фальклору актыўна звярнуліся да рэканструкцыі народных музычных інструментаў. Уладзімір Гром і Уладзімір Пузыня, Аляксандр Лось і Тодар Кашкурэвіч, Аляксандр Крамко, Віктар Кульпін, Ігар Мангушаў і многія іншыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі ўзяліся за складаную работу па вяртанні народу страчаных каштоўнасцей нацыянальнай інструментальнай музычнай культуры.

За нейкія дваццаць гадоў у канцэртна-сцэнічную практыку ўвайшлі музычныя інструменты, характэрныя для ўсіх без выключэння рэгіёнаў краіны. З'явілася і шмат майстроў, якія выраблялі беларускія народныя інструменты не толькі мадыфікаваныя, што адпавядалі сучасным патрабаванням і на якіх было б магчыма выконваць музыку розных стылявых накірункаў: еўрапейскую акадэмічную, беларускую народную, кантры, рок і іншую, але і калісьці тыповыя для аўтэнтычнай традыцыі.

Паступова пачалася работа па адраджэнні традыцый народна-інструментальнага выканання. У дзіцячых музычных школах, каледжах, гімназіях выкладчыкі-энтузіясты арганізавалі класы навучання ігры на дудцы, жалейцы, акарыне, дудзе. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў прапанаваў для абітурыентаў новую спецыялізацыю — народныя духавыя інструменты.

Сёння музычныя інструменты беларускага народа можна пачуць на фестывалях і конкурсах, на святах і навуковых канферэнцыях, у філарманічных залах, на кірмашах і выставах. Добра вядомы яны і па-за межамі краіны дзякуючы гастрольнай дзейнасці прафесійных, аматарскіх і вучэбных творчых калектываў Беларусі. Голас старажытных інструментаў упрыгожвае гучанне шматлікіх ансамбляў — інструментальных, харавых, харэаграфічных. Да выкарыстання народных музычных інструментаў усё часцей звяртаюцца айчынныя кампазітары. На добраахвотных пачатках ствараюцца музейныя калекцыі.

Народныя інструменты стагоддзямі гучалі на роднай зямлі. Яны ўпрыгожвалі штодзённы побыт, неслі працавітым беларусам радасць і аптымізм, надзею на светлую будучыню. Таму не дзіва, што народная інструментальная музычная традыцыя як самастойная, унікальная праява духоўнага жыцця беларусаў, як сусветная мастацкая каштоўнасць сёння знаходзіцца ў цэнтры ўвагі не толькі навукоўцаў і музыкантаў-прафесіяналаў, але і шматлікіх аматараў — прыхільнікаў айчыннай культуры.

***Н.П. Яканюк,***
*доктар мастацтвазнаўства, прафесар.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

In the 1990s, under the new folk wave and the movement for national independence and the revival of Belarus, the Belarusian folklore fans actively approached to the reconstruction of folk musical instruments. Uladzimir Hrom, Uladzimir Puzynia, Aliaxandr Los and Todor Kashkurevich, Aliaxandr Kramko, Viktar Kulpin, Ihar Mangushau and many other representatives of Belarusian intelligentzia took up the hard work for returning the lost values of the national instrumental music to the people.

For some twenty years musical instruments, common to all, without exception, the regions of the country became regular in concert and theatrical practice. A lot of new masters appeared; they could produce not only modified Belarusian folk instruments, according to modern requirements and on which it is possible to perform music of different styles directions (European academic, Belarusian folk, country, rock and other ones), but also it is possible to perform typical music for the authentic tradition.

Gradually the work began on the revival of the traditions of folk instrumental music-making. In the children's music schools, colleges, high schools teachers enthusiasts organized classes on training playing dudka, zhaleyka, akaryna, duda. Belarusian State University of Culture and Arts has offered to prospective students a new specialization — folk wind instruments. Today the Belarusian folk musical instruments can be heard at festivals and competitions at holidays and scientific conferences, in concert halls, at fairs and exhibitions. They are well known outside the country due to the touring of professional, amateur and training of creative collectives of Belarus. The voice of ancient instruments decorates sound of many ensembles — instrumental, choral, dance ones. National composers are increasingly turning to the use of folk musical instruments. Museum collections are created on voluntary basis.

Folk instruments sounded for centuries in their native land. They beautified daily life, carried joy and optimism, hope for a brighter future to hardworking Belarusians. It is therefore not surprising that the folk instrumental music tradition as an individual, unique manifestation of the spiritual life of Belarusians, as the world's artistic value, today is in the center of attention not only of scholars and professional musicians, but also of many fans — fans of the national culture.

**_N. Yakonyuk,_**
*Doctor of Arts, Professor.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ